Т.І. ДОЎНАР

# УЗ’ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БЕЛАРУСКАЙ ССР

У артыкуле разглядаецца пытанне аб уключэнні Заходняй Беларусі у склад Польскай дзяржавы на падставе Рыжскага мірнага дагавору 1921 г. і яе статусе,а таксама аб прычынах і падставах уз’яднання Заходняй Беларусі з Беларускай ССР.

У ходзе грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі 1918–1920 гг. тэрыторыя Беларусі была падзелена на дзве часткі: заходнюю і ўсходнюю, станаўленне ўлады і дзяржаўнасці ў якіх пайшло ў розных накірунках.

Адпаведна Рыжскаму мірнаму дагавору ад 18 сакавіка 1921 г. паміж РСФСР і Украінай, з аднаго боку, і буржуазнай Польшчай – з другога тэрыторыя Заходняй Беларусі была ўключана ў склад Польскай дзяржавы. Гэта ўключэнне было прызнана дзяржавамі Антанты ў 1923 г., калі Канферэнцыя паслоў Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі і Японіі вызначыла ўсходнія граніцы Польшчы з Літвой і СССР.

Ні ў адным з міжнародных дагавораў, заключаных Польшчай, заходнія беларускія землі не разглядаліся як асобная геаграфічная ці адміністрацыйная адзінка, адрозная ад іншай тэрыторыі Польшчы, якой павінны быць нададзены пэўныя правы. Правы ж беларусаў як нацыянальнай меншасці ў складзе Польшчы гарантаваліся некалькімі міжнароднымі дамовамі, у прыватнасці Парыжскім (1919) і Рыжскім (1921) дагаворамі. Нават зараз многімі польскія вучонымі гэтае праблемнае пытанне разглядаецца з уласных пазіцый. Так, Войцех Матэрскі. Рыжскі трактат і Беларусь. Даследуючы беларускае пытанне на польска-савцка-ўкраінскіх мірных перагаворах, якія пачаліся ў Мінску 17 жніўня 1920 г., а з верасня 1920 г. працягваліся ў Рызе, неабходна ўзяць пад увагу два яго аспекты: выкарыстанне назвы Беларусь як геаграфічнага паняцця, што з’яўляецца тыповым падчас правядзення пасяджнняў, а таксама ўспрыняцце Беларусі як палітычнага (геапалітычнаг) паняцця і суб’екта міжнароднага права, чаго абодва бакі згодна стараліся пазбегнуць, не дапусціўшы ні дэлшегацыю Сацыялітсынай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ), ні дэлегацыю БНР да ўдзелу ў перагаворах.

Аднак існуе праблема, ці можна ўвогуле гаварыць у другой палове 1920 г. пра суб’ектнасць Беларусі і якой Беларусі – той , якую прадстаўляла Сацыялітсынаая Савецкая Рэспубліка Беларусі, створаная расійскімі бальшавікамі ў студзені 1919 г. і адноўленая ў ліпені 1920 г., ці той, якую ўвасаблялі канкурыруючыя паміж сабой агтыбальшавіцкія Найвышэйшая Рада БНР і Народная Рада БНР

Пасля ўваходу бел. зямель у склад Польскай дзяржавы адбыліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле. Згодна адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу, прынятаму ў Польшчы, заходнебеларускія землі былі падзелены на 4 ваяводствы: Віленскае, Навагрудскае, Беластоцкае і Палескае (з цэнтрам у г. Брэсце). Ваяводствы дзяліліся на паветы, у якія ўваходзілі гарадскія і сельскія гміны. Гарады з колькасцю насельніцтва больш 75 тыс. складалі самастойныя паветы. Сельскія гміны дзяліліся яшчэ і на грамады, якія складаліся, як правіла, з некалькіх хутароў або невялікіх вёсак альбо адной больш буйнай вёскі.

На палітыку Польшчы адносна Беларусі зразумела, уплыва тая грамадска-палітычная сітуацыя, якая склалася ш гэты перыяд. У адпаведнасці з прынятай у 1921 г. Канстытуцыяй Польшча з’яўлялася буржуазна-феадальнай дэмакратычнай, парламенцкай рэспублікай. Вышэйшымі органамі ўлады і кіравання ў дзяржаве з’яўляліся Прэзідэнт, Сойм, Сенат, Савет Міністраў.

Прэзідэнт Польшчы, які абіраўся на 7 гадоў, фармальна з’яўляўся галавой дзяржавы, кіраваў органамі выканаўчай улады, склікаў на сесіі Сойм і Сенат, прызначаў усіх суддзяў,

быў галоўнакамандуючым войска і г.д. Аднак яго ўлада ў значнай ступені абмяжоўвалася Соймам і Сенатам, якія з’яўляліся заканадаўчымі органамі дзяржавы. Прэзідэнт заканадаўчай улады не меў. Нарматыўныя прававыя акты Прэзідэнта павінны былі пацвярджацца галавой урада і адпаведным міністрам, якія былі адказныя за іх перад Соймам. У Польшчы вярхоўным галавой дзяржавы з 1918 па 1922 гг. быў Ю. Пілсудскі.З 1922 г. Прэзідэнтам Польскай рэспублікі з’яўляўся Г. Нарутовіч, з 1923 па 1926 гг. – С. Вайцяхоўскі.

Здзейснены ў маі 1926 г. дзяржаўны пераварот карэнным чынам змяніў сістэму органаў дзяржаўнай улады Польшчы. Былі істотна пашыраны І. Масціцкі, які на пасадзе прэзідэнта знаходзіўся два тэрміны аж да 1939 г. Прэзідэнт надзяляўся правам выдаваць заканадаўчыя акты, мог самастойна распускаць Сойм і Сенат, роля якіх у дзяржаве значна паслабела. Усталяваны ў краіне пасля 1926 г. дзяржаўна-палітычны рэжым атрымаў назву «санацыйны» (ад лат. sanatio – аздараўленне). Ён характарызаваўся значнай стабілізацыяй эканамічнай і палітычнай сітуацыі ўнутры дзяржавы, а таксама змяненнем знешняй палітыкі Польшчы, якая знаходзілася ў варожых адносінах як з СССР, так і з Германіяй.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд знаходжання яе ў складзе Польшчы фактычна быў усталяваны ваенна-паліцэйскі рэжым, які ажыццяўляўся з дапамогай мясцовага дзяржаўнага апарата. Мясцовымі органамі дзяржаўнай адміністрацыі ў кожным ваяводстве з’яўляліся ваявода і ваяводскае ўпраўленне. Ваявода прызначаўся прэзідэнтам Польшчы па прапанове міністра ўнутраных спраў, зацверджанай Саветам Міністраў. Ваявода каардынаваў дзейнасць усіх дзяржаўных органаў на тэрыторыі ваяводства і меў кантралюючыя паўнамоцтвы над усімі дзяржаўнымі органамі, якія непасрэдна яму не падпарадкоўваліся. Пасады ваяводаў у чатырох заходнебеларускіх ваяводствах у 1921–1939 гг. займалі асобы з асяроддзя вышэйшых афіцэраў і генералаў польскага войска, а таксама буйныя памешчыкі. Пры ваяводзе існавала ваяводскае ўпраўленне, якое складалася з аддзелаў: агульнага, бяспекі, самакіравання, адміністрацыйнага, ваеннага, земляробства, прамысловасці, аховы здароўя, працы і інш. Аддзелы займаліся непасрэдным мясцовым кіраўніцтвам і разглядам канкрэтных пытанняў па накірунках сваёй дзейнасці.

Галавой павета з’яўляўся стараста, які прызначаўся міністрам унутраных спраў і ваяводам і непасрэдна падпарадкоўваўся ваяводзе. Паўнамоцтвы старасты ў павеце шмат у чым адпавядалі паўнамоцтвам ваяводы. Пры старасце дзейнічала павятовае ўпраўленне, якое складалася з рэфератаў (аддзелаў).

У склад гміннай адміністрацыі ўваходзілі войт і гміннае ўпраўленне. У апошняе ўваходзілі намеснік войта і два-тры засядацелі. Грамады, як правіла, узначальвалі солтысы.

Да 1933 г. у паветах існавалі органы мясцовага самакіравання – павятовыя соймікі, дэлегаты на якія абіраліся гміннымі сходамі. Аднак гэтыя органы з’яўляліся ў значнай ступені дэкларатыўнымі, паколькі без удзелу старасты яны нічога не маглі вырашыць. Пасля 1933 г. у ваяводствах ствараліся ваяводскія рады, у паветах – павятовыя рады. Члены павятовых рад абіраліся на гмінных радах. Выканаўчымі органамі павятовых рад з’яўляліся павятовыя ўпраўленні на чале са старастам. Аднак галавой павета па-ранейшаму з’яўляўся стараста. Фактычна кожны ваявода і стараста, а таксама такія важныя асобы як кіраўнік павятовай паліцыі праводзілі самастойную палітыку, якая ўсё больш набывала дыскрымінацыйны характар у адносінах да беларускага насельніцтва.

Паступова палітычны рэжым у Польшчы набываў рысы таталітарнага, аб чым сведчыла заканадаўства. Шэраг заканадаўчых актаў пашыралі паўнамоцтвы мясцовай адміністрацыі, паліцыі, судова-следчага апарата ў барацьбе з нацыянальным рухам на беларускіх землях. У адпаведнасці з законам ад 14 лютага 1928 г. паліцыі і ўзброеным сілам дазвалялася ўжываць зброю для разгону шэсцяў і дэманстрацый. Дэкрэт прэзідэнта і савета міністраў ад 17 чэрвеня 1934 г. дазваляў любога чалавека, падазраваемага ў антыдзяржаўнай дзейнасці, па прадстаўленні ўладаў «затрымаць і прымусова ўтрымліваць

у месцах ізаляцыі да 3-х месяцаў». Гэты тэрмін мог быць падоўжаны яшчэ на 3 месяцы. У г. Бяроза Картузская быў створаны канцэнтрацыйны лагер для палітычных зняволеных.

Аб таким накирунку развицця польскайдзяржавы сведчыла і новая Канстытуцыя Польшчы, прынятая ў 1935 г. Канстытуцыя змяніла кампетэнцыю і парадак фарміравання цэнтральных органаў улады. Прэзідэнт стаў валодаць больш важкімі паўнамоцтвамі. Яму фактычна былі падпарадкаваны ўсе іншыя органы. Кампетэнцыя і склад парламента звужаліся, частка паўнамоцтваў пераходзіла да ўрада. Сойм складаўся з дэпутатаў (усяго ў яго склад уваходзіла 208 дэпутатаў), а Сенат – з 96 сенатараў, прычым 32 сенатары прызначаў прэзідэнт, а 64 абіраліся непасрэдна грамадзянамі. Аднак гаварыць аб роўных дэмакратычных выбарах у дадзеным выпадку не прыходзіцца. Абірацца і абіраць маглі толькі грамадзяне, якія мелі вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю, афіцэрскае званне або якія займалі кіраўнічыя пасады ў дзяржаўным апараце. Вядома, пры такіх умовах як сяляне, так і рабочыя выбарчым правам не валодалі. Варта адзначыць і нізкую выбарчую актыўнасць тых асобаў, якія валодалі выбарчым правам. На выбарах у Сойм у 1935 г. па ўсёй Польшчы ў галасаванні прыняло ўдзел толькі 46 % выбаршчыкаў, а ва ўсходніх раёнах гэты працэнт быў яшчэ меншым.

У польскай дзяржаве ўсходнім раёнам (так званым «усходнім крэсам»), у якія ўваходзіла і Заходняя Беларусь, была адведзена роля аграрна-сыравіннага прыдатка больш развітых карэнных рэгіёнаў Польшчы. Так, Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы, якія складалі 23 % усёй тэрыторыі дзяржавы і 11 % яе насельніцтва, мелі толькі 2,8 % прадпрыемстваў, на якіх працавалі 1,9 % рабочых краіны (1937 г.). 85 % насельніцтва Заходняй Беларусі жыло ў сельскай мясцовасці і 79 % было занята сельскай гаспадаркай.

Эканамічная палітыка ў сельскай гаспадарцы адносна Заходняй Беларусі насіла яўна дыскрымінацыйны характар. Ва ўмовах абвяшчэння прыватнай уласнасці на зямлю эканамічнай асновай дзяржавы больш паловы сялян Заходняй Беларусі адносіліся да катэгорыі малазямельных або беззямельных. Палітыка «асадніцтва», распачатая яшчэ ў 1920 г. на падставе спецыяльнага закона ад 17 снежня 1920 г. «Аб надзяленні зямлёй салдат польскай арміі, якія адзначыліся ў вайне супраць Расіі», заключалася ў перасяленні з цэнтральнай Польшчы ва ўсходнія раёны краіны, у тым ліку і на беларускія землі, адстаўных вайскоўцаў польскага войска («асаджэння» іх на гэтай тэрыторыі) і надзялення іх зямлёй. У 20-я гг. яна набыла шырокамаштабны характар.

Праведзеная ў канцы 20-х гг. аграрная рэформа прывяла да таго, што значная частка сялянскіх земляў прымусова была перададзена ва ўласнасць дзяржавы. Каля 40 % зямель на тэрыторыі Заходняй Беларусі належыла памешчыкам або дзяржаве. Дзяржаўнымі землямі надзяляліся асаднікі, якім прадастаўляліся значныя палёгкі ў галіне падаткаабкладання, атрыманні крэдытаў і інш., у той час як асноўны падатковы цяжар ускладаўся на мясцовае сялянства.

Сацыяльнае і палітычнае ўшчамленне правоў беларусаў дапаўнялася нацыянальным і рэлігійным прыгнётам. Беларускае насельніцтва падвяргалася падвяргалася нацыянальнай дыскрымінацыі, прымусоваму апалячванню і акаталічванню, хаця адпаведна Рыжскаму мірнаму дагавору 1921 г. Польшча абавязвалася прадаставіць насельніцтву Заходняй Беларусі ўсе правы, якія забяспечвалі б вольнае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў. Беларуская мова паступова выкаранялася з выкарыстання не толькі дзяржаўнымі органамі, але і органамі самакіравання, а таксама з адукацыйных устаноў. Беларусы выціскаліся з палітычнага жыцця. Так, на выбарах 1922 г. у Сойм Польшчы з 444 дэпутатаў было абрана толькі 11 беларусаў, у склад членаў Сената – са 111 толькі 3. У 1928 г. у Сойм патрапіла 10 беларусаў, у Сенат – 2. На выбарах 1935 г. і 1938 г. не было абрана ні аднаго беларуса[1]. Пры прыняцці на пасады ў органах мясцовай улады перавага аддавалася палякам, як правіла асаднікам, выхадцам з цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы.

Мэтанакіраваная палітыка дыскрымінацыі і паланізацыі беларускага насельніцтва прывяла да таго, што ў 1939 г. у Заходняй Беларусі на 4 млн. беларусаў не было ні адной

беларускай сярэдняй школы, вышэйшай навучальнай установы, нацыянальнага тэатра, бібліятэкі і г.д. Беларускія газеты зачыняліся пасля выхаду некалькіх нумароў. Ва ўсіх дзяржаўных установах афіцыйнай мовай стала толькі польская.

Аб’ектам асаблівай увагі кіраўніцтва Польшчы з'яўлялася беларуская царква, як праваслаўная, так і грэка-каталіцкая, асабліва ў сувязі з захаваннем апошняй пэўных нацыянальных традыцый, у тым ліку богаслужэння на беларускай мове. Намагаючыся зламаць патрыятызм духавенства, польскія ўлады з другой паловы 20-х гадоў пачалі ўсё часцей прымяняць паліцэйскія і судовыя рэпрэсіі. Напрыклад, за афармленне рэгістрацыі нараджэння дзяцей на беларускай мове ў якасці санкцыі, па прычыне фальсіфікацыі дакументаў, магло прымяняцца турэмнае зняволенне.

Адкрытая палітыка польскіх уладаў на паскораную асіміляцыю беларусаў і палітычная бяспраўнасць насельніцтва заходнебеларускіх земляў выклікалі частыя стыхійныя і арганізаваныя пратэсты.

Беларускія арганізацыі Польшчы неаднаразова спрабавалі звярнуць увагу Лігі Нацый на парушэнні правоў беларусаў у гэтай дзяржаве. Напрыклад, 15 жніўня 1929 г. фракцыя польскага сойма «Беларускі пасольскі клуб» падала мемарыял у Лігу Нацый са скаргай на проціпраўныя дзеянні польскіх уладаў у адносінах да нацыянальных меншасцяў. Польшча была на першым месцы сярод абскарджаных краін. На працягу 1920–1930 гг. на яе было пададзена 155 скаргаў. Аднак скаргі беларускіх арганізацый, а таксама Рады і урада БНР ніколі не разглядаліся Радай Лігі Нацый. Супраць парушэння правоў беларусаў у Польшчы пратэставалі ў розных краінах Еўропы і ЗША. Напрыклад, у 1927 – 1928 гг. у сувязі з разгромам Беларускай сялянска-рабочай грамады адбыліся мітынгі ў Парыжы, Празе, Нью-Йорку, Чыкага і іншых гарадах.

Савецкі Саюз як праваправаемнік дагавора РСФСР і УССР з Польшчай ад 18 сакавіка 1921 г. меў магчымасць абараніць правы рускіх, украінцаў і беларусаў у Польшчы на падставе арт. VII Рыжскага дагавора, паводле якога Польшча абавязвалася забяспечваць свабоднае развіццё культуры і мовы нацыянальных меншасцяў, у тым ліку адчыняць нацыянальныя школы, ствараць саюзы і арганізацыі для развіцця культуры і інш. Аналагічнымі правамі карысталіся і палякі на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Украіны. Аднак такое пытанне на міжнародным узроўні амаль не падымалася. БССР як канстытуцыйна незалежная рэспубліка толькі аднойчы выкарыстала магчымасць абароны правоў беларусаў у Польшчы. Старшыня СНК і нарком замежных спраў БССР А.Р. Чарвякоў 21 жніўня 1921 г. накіраваў ноту пратэсту міністру замежных спраў Польшчы К. Скірмунту, у якой гаварылася аб закрыцці 148 беларускіх школ і забароне адчыняць новыя школы, ствараць кааператывы і таварыствы ўзаемнай дапамогі і інш. Урад БССР лічыў, што гэта робіцца без ведама польскага урада. У сваю чаргу ён запэўніваў, што ў БССР будуць захаваны правы польскай меншасці[1]. Аднак дыскрымінацыйная палітыка ў адносінах да насельніцтва Заходняй Беларусі працягвалася і далей.

Летам 1939 г. пачаўся працэс рэзкай змены геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе. 23 жніўня 1939 г. урад СССР заключыў дамову з Германіяй, падпісаўшы пакт аб ненападзе, дапоўнены сакрэтнымі пратаколамі, якія падзялялі сферы ўплыву Германіі і Савецкага Саюза (пакт Молатава–Рыбентропа). У сакрэтных пратаколах адзначалася, што ў выпадку тэрытарыяльна-палітычнага пераўладкавання абласцей, якія ўваходзілі ў склад прыбалтыйскіх дзяржаў (Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы), паўночная мяжа Літвы адначасова з’ўляецца граніцай сфер інтарэсаў Германіі і СССР. Пры гэтым інтарэсы Літвы адносна Віленскай вобласці прызнаюцца абодвума бакамі. Дагавор быў ратыфікаваны Вярхоўным Саветам СССР 31 жніўня 1939 г. 1 верасня 1939 г. Германія пачала вайну супраць Польшчы. **У** алпаведнасці з папярэднімі дамоўленасцямі 17 верасня Чырвоная Армія перайшла мяжу СССР і ўступіла на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. На працягу 10 дзён уся тэрыторыя Заходняй Беларусі была занята савецкімі войскамі. Па ініцыятыве мясцовага насельніцтва, а таксама прадстаўнікоў Чырвонай Арміі

на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі пачалі стварацца часовыя органы народнай улады: сялянскія камітэты сёлаў і валасцей, з'езды і нарады сялянскіх камітэтаў валасцей і паветаў, часовыя ўпраўленні гарадоў і паветаў, у склад якіх увайшлі і прадстаўнікі Чырвонай Арміі, а таксама прадстаўнікі НКУС. У кастрычніку 1939 г. у цэнтрах былых ваяводстваў былі створаны чатыры Часовыя ўпраўленні абласцей: Віленскае, Наваградскае, Беластокскае і Палескае.

У сярэдзіне кастрычніка 1939 г. урад СССР у адпаведнасці з уласнымі стратэгічнымі палітычнымі мэтамі перадаў Літве Вільню і частку былога Віленскага ваяводства.

22 кастрычніка на аснове савецкай выбарчай сістэмы на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі праведзены выбары дэпутатаў у Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі. На падставе прынятага Палажэння аб выбарах было ўтворана 929 выбарчых акругаў. Удзельнічаць у выбарах мелі права ўсе жыхары, дасягнуўшыя 18 гадоў. Высоўваць кандыдатаў у дэпутаты Народнага (Нацыянальнага) сходу мелі права часовыя ўпраўленні гарадоў і паветаў, сходы працоўных на прадпрыемствах і сялянскія камітэты – па аднаму дэпутату на адну выбарчую акругу.У выніку было высунута 929 кандыдатаў і абрана 927 дэпутатаў (2 кандыдаты не набралі неабходнай колькасці (больш за 50 %) галасоў).

Папярэдне пытанні дзяржаўнай перабудовы на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, як сведчаць апублікаваныя ў апошні час дакументы па знешняй палітыцы СССР, былі разгледжаны Палітбюро ЦК УКП(б). Так, рашэнне Палітбюро, дataванае 4 верасня – 3 кастрычніка 1939 г., прадугледжвала: «1. Склікаць Украінскі Народны Сход… і Беларускі Народны Сход з выбарных па абласцях Заходняй Беларусі (тэрыторыя былых ваяводстваў Навагрудскага, Віленскага, Беластокскага і Палескага)»[1] .

Гэтыя Народныя сходы павінны былі:

1) зацвердзіць перадачу памешчыцкіх земляў сялянскім камітэтам;
2) вырашыць пытанне аб характары ствараемай улады;
3) рашыць пытанне аб уваходжанні ў склад СССР, г.зн. аб уваходжанні беларускіх абласцей у склад БССР;
4) рашыць пытанне аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці.

У адпаведнасці з п. 6 пастановы Палітбюро ЦК УКП(б), для арганізацыі выбараў Народнага сходу Заходняй Беларусі ў Беластоку даручалася стварыць Камітэт па арганізацыі выбараў. Для дапамогі ў арганізацыі выбараў у склад камітэта належыла накіраваць трох прадстаўнікоў ад Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Пункт 8 пастановы загадваў «правесці выбарчую кампанію ў Народны сход пад лозунгам усталявання савецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі, уваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР, ухвалення канфіскацыі памешчыцкіх земляў; патрабавання нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці. Па пералічаных пытаннях ЦК УКП(б) Беларусі (т. Панамарэнку) належыла падрыхтаваць адпаведныя дэкларацыі, якія павінны быць прынятыя Народнымі сходамі»[2] .

Народны (Нацыянальны) сход пачаў сваю працу 28 кастрычніка 1939 г. у Беластоку. У павестку дня былі ўключаны наступныя пытанні: 1) аб дзяржаўнай уладзе;

2) аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР; 3) аб канфіскацыі памешчыцкіх земляў; 4) аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці. У адпаведнасці з разгледжанымі пытаннямі сход ухваліў чатыры аднайменныя дэкларацыі, асноўная сутнасць якіх – абвяшчэнне ўсталявання Савецкай улады ў Заходняй Беларусі і імкненне ўз'яднацца з Беларускай ССР. Дэкларацыі юрыдычна замацавалі новыя прынцыпы дзяржаўнай улады. У Дэкларацыі аб дзяржаўнай уладзе абвяшчалася: «Беларускі Народны (Нацыянальны) сход, як адзіны і паўнаpraўны орган, які адлюстроўвае волю народаў Заходняй Беларусі … абвяшчае на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі ўсталяванне савецкай улады. З гэтага часу ўся ўлада на тэрыторыі Заходняй Беларусі належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных»[1] . Гэтым актам заканадаўча афармлялася ўсталяванне новай савецкай сістэмы ўлады ў Заходняй Беларусі.

Другая дэкларацыя аб’яўляла аб імкненні Заходняй Беларусі ўвайсці ў склад БССР і «ўз’яднаць беларускі народ у адзінай дзяржаве»[2] .

Дэкларацыя аб канфіскацыі памешчыцкіх земляў па сваёй сутнасці зацвердзіла дзейнасць сялянскіх камітэтаў па канфіскацыі зямлі без усялякага выкупу памешчыцкіх земляў, земляў манастыроў і земляў дзяржаўных службоўцаў. Адначасова абвяшчалася дзяржаўная ўласнасць на зямлю. Тым самым і сяляне пазбаўляліся права ўласнасці на зямлю.

Дэкларацыя аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці паклала пачатак перабудовы ўсёй сістэмы народнай гаспадаркі Заходняй Беларусі на савецкай аснове.

Дэкларацыі Народнага (Нацыянальнага) сходу і хадайніцтва поўнамоцнай камісіі, абранай Нацыянальным сходам, сталі прававой асновай для прыняцця 2 лістапада 1939 г. Вярхоўным Саветам СССР пастановы «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР з уз’яднаннем яе з Беларускай ССР» [3] . 14 лістапада Вярхоўны Савет БССР пастанавіў прыняць Заходнюю Беларусь у склад БССР і «ўз’яднаць тым самым беларускі народ у адзінай беларускай дзяржаве»[4] .

4 снежня 1939 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў указ аб стварэнні на тэрыторыі Заходняй Беларусі пяці абласцей: Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай (з цэнтрам у Вілейцы) і Пінскай.

З мэтай усталявання савецкіх органаў улады і кіравання на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 7 снежня 1939 г. былі зацверджаны склады абласных выканаўчых камітэтаў (як правіла, з кіруючых работнікаў усходніх абласцей Беларусі), хоць у адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1937 г. павінны былі адбыцца выбары ў мясцовыя Саветы. Аблвыканкамы ў сваю чаргу фарміравалі склад райвыканкамаў і сельскіх выканкамаў. Усяго ў даваенныя гады, па даным А.Ф. Вішнеўскага, колькасць кіруючых работнікаў з усходніх беларускіх раёнаў, пераведзеных на працу ў мясцовыя органы ўлады і кіравання Заходняй Беларусі, складала больш за 14 тыс. чалавек[1] .

У сакавіку 1940 г. былі праведзены выбары дэпутатаў ад заходніх абласцей Беларускай ССР у Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўны Савет БССР. Выбары ж у мясцовыя Саветы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўпершыню былі праведзены 15 снежня 1940 г.

У студзені 1940 г. указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР уадпаведнасці з савецкім адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам на тэрыторыі Заходняй Беларусі замест 32 паветаў быў створаны 101 раён.

З уваходжаннем заходніх беларускіх земляў у склад Беларускай ССР на гэту тэрыторыю было распаўсюджана дзеянне заканадаўства СССР і БССР. Пачаўся хуткі працэс саветызацыі грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця Заходняй Беларусі. Пры гэтым новыя змены мелі неадназначны і супярэчлівы характар. Так, з аднаго боку, пачалася нацыяналізацыя зямлі і прамысловасці, прымусовая калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Акрамя таго, пачалі праводзіцца антыцаркоўныя акцыі і шырокія палітычныя рэпрэсіі, у тым ліку супраць беларускай інтэлігенцыі. Аднак, з другога боку, экспрапрыіраванымі шматлікімі землямі польскіх землеўласнікаў надзяляліся беларускія сяляне, пайшоў актыўны працэс беларусізацыя сістэмы народнай адукацыі, дзяржаўных устаноў, што вызвала станоўчую ацэнку замежных дзеячоў і эміграцыйных колаў. Адчыняліся беларускія школы адчыняліся іншыя навучальныя установы і іх колькасць паступова павялічвалася. Патрэбна таксама адзначыць, што паляпшалася медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, ліквідоўвалася беспрацоўе і г.д.

Увогуле ж уз’яднанне беларускага народа ў адзінай дзяржаве стала самай важнай гістарычнай падзеяй у перадваенны час для кожнага беларуса.